**22.** Выберыце назоўнікі, якія напішаце праз злучок.

*1) хлапчукі(гарэзы); 2) конь(скакун); 3) Свіцязь(возера).*

**А)** усе назоўнікі. **Б)** няма такіх назоўнікаў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

---

**23.** У якіх словах на месцы пропуску напішаце літару ***я***?

*1) лі..на; 2) энтузі..зм; 3) і..рархія; 4) рэкві..м.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма такіх слоў. **В)** у 1, 2. **Г)** у 2, 3. **Д)** у 3, 4.

---

**24.** Выберыце сказ(-ы), у якім(-іх) правільна пастаўлены знакі прыпынку.

*1. Ігнату заставалася цяпер ісці, куды вочы глядзяць.*

*2. Шапацела дзяўчыне штосьці лістота, ды слоў чамусьці не гаварыла.*

*3. Шумныя воды – адзнака прадвесня павольна кіруюцца ў новае рэчышча.*

**А)** усе сказы. **Б)** няма такіх сказаў. **В)** 1, 3. **Г)** 2. **Д)** 3.

---

**25.** Хто з вядомых мастакоў слова і ў якім творы напісаў: *“Музыка нашых лясоў мілагучнасцю строгай вуху і сэрцу мілей за літаўры і ліру”*?

**А)** Я. Баршчэўскі “Белая Сарока”. **Б)** К. Веранiцын “Тарас на Парнасе”.

**В)** М. Гусоўскі “Песня пра зубра”. **Г)** А. Міцкевіч “Свяцязянка”.

**Д)** “Слова пра паход Ігаравы”.

---

**26.** Узор са шкла рознага колеру (у вокнах, дзвярах) – гэта … .

**А)** грым. **Б)** грыф. **В)** эскіз. **Г)** вітраж. **Д)** вітрына.

---

**27.** Дадзены літаратурныя тэрміны: *1) іронія; 2) гумар; 3) сатыра; 4) алегорыя; 5) рэмарка.* Якому тэрміну адпавядае значэнне *‘паказ якой-небудзь з’явы ў смешным, камічным выглядзе, калі пры гэтым знешне камічная трактоўка спалучаецца з унутранай сур’ёзнасцю’*?

**А)** 1. **Б)** 2. **В)** 3. **Г)** 4. **Д)** 5.

---

**28.** Нацыянальная бібліятэка Беларусі мае непаўторны дызайн. У яе кнігасховішчах змяшчаецца вялікая колькасць кніг і рукапісаў, з якімі можна папрацаваць у чытальных залах. А колькі паверхаў у бібліятэцы?

**А)** 15. **Б)** 19. **В)** 21. **Г)** 23. **Д)** 25.

---

**29.** Закончыце выраз.

*Ад’ектывацыя – гэта пераход іншых часін мовы ў … .*

**А)** у назоўнікі. **Б)** у дзеясловы. **В)** у прыметнікі. **Г)** у займеннікі. **Д)** у прыслоўі.

---

**30.** У якім годзе Купалаўскі тэатр атрымаў імя ў гонар паэта Янкі Купалы?

**А)** у 1942 годзе. **Б)** у 1944 годзе. **В)** у 1947 годзе.

**Г)** у 1952 годзе. **Д)** у 1957 годзе.

---

Арганізатар гульні-конкурсу «Буслік» –
Грамадскае аб’яднанне «Беларуская асацыяцыя «Конкурс»
220045, г. Мінск, вул. Яна Чачота, 16 тэл. (017) 375 66 17, 375 36 23
e-mail: info@bakonkurs.by https://bakonkurs.by/ https://конкурс.бел/

КОНКУРС

Унітарнае прадпрыемства «Выдавецкі цэнтр БА «Конкурс». Заказ 4. Тыраж 9750 экз. 2021 г.

Гульня-конкурс па беларускай мове і літаратуры

# «БУСЛІК-2021»

*Чацвер, 18 лютага 2021 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 30 балаў;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (10 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 10 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 10 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- за няправільны адказ аднімаецца чвэрць балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- максімальная колькасць балаў, якой ацэньваецца заданне конкурсу, – 150, аднак аўтары задання не прадугледжваюць яго поўнага выканання ўдзельнікамі; у заданне гульні-конкурсу ўключаны пытанні, веды пра якія не прадугледжаны школьнай праграмай;
- карыстацца даведнікамі, падручнікамі, слоўнікамі, іншымі пісьмовымі або друкаванымі матэрыяламі, электроннымі сродкамі інфармацыі і сувязі забараняецца; не дазваляецца таксама абменьвацца інфармацыяй з іншымі ўдзельнікамі і задаваць пытанні настаўніку; ручка, чарнавік, картка і заданне – гэта ўсё, што патрэбна мець удзельніку;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем і чарнавік удзельнік забірае з сабой і захоўвае іх да падвядзення канчатковых вынікаў;
- вынікі ўдзельнікаў размяшчаюцца на сайце https://bakonkurs.by/ праз 1–1,5 месяцы пасля правядзення конкурсу.

---

## Заданне для вучняў 9 класа

**1.** Здаўна ў народзе можна пачуць:

| | |
|---|---|
| *1. Лепш недагаварыць, чым … .* | *а) рабі;* |
| *2. Менш гавары – больш … .* | *б) шкодзіць;* |
| *3. Слухаць добрай рады не … .* | *в) перагаварыць.* |

Якія дзеясловы прапушчаны?

**А)** 1-а, 2-б, 3-в. **Б)** 1-б, 2-а, 3-в. **В)** 1-б, 2-в, 3-а.

**Г)** 1-в, 2-б, 3-а. **Д)** 1-в, 2-а, 3-б.

---

*Вось сонца ўстае пакрысе,*
*І лугу крыштальная ваза*
*Зайграла ў світальнай расе*
*Рубінам,*
*Сапфірам,*
*Алмазам.*

**2.** Колькі разоў сустракаецца апошні гук назоўніка ***град*** у словах вершаваных радкоў В. Гардзея?

**А)** 0. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

---

**3.** Якія назоўнікі прапушчаны ва ўстойлівых выразах?

*1) белы як … ; 2) моцны як … ; 3) лёгкі як …; 4) патрэбны як … .*

*а) пярына; б) палатно; в) паветра; г) дуб.*

**А)** 1-а, 2-б, 3-в, 4-г. **Б)** 1-б, 2-г, 3-а, 4-в. **В)** 1-в, 2-а, 3-г, 4-б.

**Г)** 1-г, 2-в, 3-б, 4-а. **Д)** 1-в, 2-г, 3-б, 4-а.

**4.** Выберыце з прапанаваных прыклады, у якіх правільна ўжыты займеннікі:

*1) думаць пра сябе; 2) з'еў нішто кіслае; 3) нікому не сказаў; 4) дзякую цябе.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма такіх прыкладаў. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 3. **Д)** 2, 4.

---

**5.** У залежнасці ад ступені звязнасці кампанентаў словазлучэнні падзяляюцца на сінтаксічна свабодныя і сінтаксічна несвабодныя (звязаныя). Вызначце з прапанаваных сказ, у якім ёсць сінтаксічна несвабоднае словазлучэнне.

*1. На цёмным небе свецяцца зоркі.*

*2. У класе было дванаццаць хлопчыкаў.*

*3. Пасля заняткаў пайшлі ў музей.*

**А)** усе сказы. **Б)** няма такіх сказаў. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

---

**6.** Выберыце правільныя варыянты. *Паводле адносін выказвання да рэчаіснасці вылучаюцца такія тыпы сказаў, як … .*

*1) простыя сказы; 2) складаныя сказы; 3) сцвярджальныя сказы;*

*4) адмоўныя сказы; 5) апавядальныя сказы; 6) пабуджальныя сказы.*

**А)** усе варыянты. **Б)** няма такіх варыянтаў. **В)** 1, 2. **Г)** 3, 4. **Д)** 5, 6.

---

**7.** Выберыце правільна ўтвораныя словазлучэнні.

*1) рыначная кан'енктура; 2) рыначная кан'юнктура; 3) навуковы тракт;*

*4) навуковы трактат; 5) міжнародны форум; 6) міжнародны кворум.*

**А)** усе словазлучэнні. **Б)** няма правільна ўтвораных словазлучэнняў.
**В)** усе словазлучэнні, акрамя 3. **Г)** 1, 3, 6. **Д)** 2, 4, 5.

---

**8.** У якім сказе з дадзеных на месцы пропуску неабходна паставіць працяжнік?

*1) Бабуля слухала_ прыплюшчыўшы вочы_ і толькі згаджалася.*

*2) Мядзведзь спыніўся ля канавы, а_ выбраўшы больш зручнае месца_ смела рушыў наперад.*

*3) Не шукаючы_ не знойдзеш.*

**А)** ва ўсіх сказах. **Б)** няма такіх сказаў. **В)** у 1. **Г)** у 2. **Д)** у 3.

---

**9.** Вызначце правільна напісаныя дзеепрыметнікі.

*1) напісанны; 2) пабеленны; 3) разгледжаны; 4) вывучаны.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных прыкладаў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

---

**10.** Вызначце тып дадзенага сказа.

*Хай будуць сцежкі невядомы і гору і бядзе ў той дом, што мы завём бацькоўскім домам, што хатай матчынай завём (Р. Барадулін).*

**А)** просты сказ. **Б)** складаназлучаны сказ.
**В)** складаназалежны сказ. **Г)** бяззлучнікавы складаны сказ.
**Д)** складаны сказ з рознымі відамі сувязі.

---

**11.** Выберыце толькі прыназоўнікі.

*1) менавіта; 2) не глядзеў; 3) з-пад; 4) над.*

**А)** усе прыназоўнікі. **Б)** няма прыназоўнікаў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

---

**12.** Ёсць лік 1000. Як правільна вымавіць?

**А)** [тыс'ача]. **Б)** [тыс'эча]. **В)** [тысача]. **Г)** [тышша]. **Д)** [тышча].

---

**13.** У якіх словах з дадзеных на месцы пропуску напішаце літару ***а***?

*1) дж..мпер; 2) дж..нтэльмен; 3) дж..гіт; 4) дж..кузі; 5) дж..ла.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма такіх слоў. **В)** у 1, 2. **Г)** у 3, 4. **Д)** у 4, 5.

---

**14.** Дадзены сказ: *Цябе чакае ў госці лес,* ***напоены салодкім водарам кветак і ягад, гаркаватым пахам грыбоў****.* Выдзеленая частка сказа з'яўляецца … .

**А)** устаўной канструкцыяй. **Б)** параўнаннем. **В)** выказнікам.
**Г)** дзеепрыметным зваротам. **Д)** дзеепрыслоўным зваротам.

---

**15.** Якія словы з дадзеных напісаны правільна?

*1) бульён; 2) карьер; 3) піяўка.*

**А)** усе словы. **Б)** няма такіх слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

---

**16.** Уважліва прачытайце сказ: *З самага краю на лясных прагалах стаялі маладзенькія бярозкі, якія толькі-толькі выпускалі пахучыя лісточкі_ надаючы лесу асаблівую чароўнасць.* Які знак прыпынку неабходна паставіць на месцы пропуску?

**А)** знак прыпынку не ставіцца. **Б)** працяжнік. **В)** коску.
**Г)** двукроп'е. **Д)** кропку з коскай.

---

**17.** Выберыце з прапанаваных назоўнік, які мае значэнне *'ўласцівасць юнага'*.

*1) юнацкасць; 2) юнацтва; 3) юнга; 4) юннат.*

**А)** няма такога назоўніка. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

---

**18.** У якіх сказах неабходна на месцы пропуску паставіць коску?

*1. Скошаная раніцай_ трава ўжо добра падвяла на сонцы.*

*2. На полі зямлю прабіла рунь_ абуджаная веснавым дажджом.*

*3. Здзіўленая_ яна вырашыла адразу ж разабрацца ў гэтай сітуацыі.*

**А)** ва ўсіх сказах. **Б)** няма такіх сказаў. **В)** у 1, 2. **Г)** у 1, 3. **Д)** у 2, 3.

---

**19.** Дадзены рускія словы: *1) каблук; 2) камыш; 3) ступенька; 4) кролик.* Падбярыце беларускія адпаведнікі: *а) чарот; б) трус; в) абцас; г) прыступка.*

**А)** 1-а, 2-б, 3-в, 4-г. **Б)** 1-г, 2-в, 3-б, 4-а. **В)** 1-б, 2-г, 3-а, 4-в.
**Г)** 1-б, 2-в, 3-а, 4-г. **Д)** 1-в, 2-а, 3-г, 4-б.

---

**20.** Вызначце разрад займеннікаў ***іншы, кожны, самы***.

**А)** асабовыя. **Б)** прыналежныя. **В)** указальныя.
**Г)** азначальныя. **Д)** адносныя.

---

**21.** У якіх словах з прапанаваных на месцы пропуску напішаце літару ***в***?

*1) за..очны; 2) кара..ул; 3) Радзі..онаў; 4) ..узлы.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма такіх слоў. **В)** у 1, 2. **Г)** у 2, 3. **Д)** у 3, 4.